Нарэйка, Т. І. Праблемы гістарыяграфіі культурна-асветніцкай дзейнасці езуітаў на беларускіх землях / Т. І. Нарэйка // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БДУ, 2007. – С. 153–157

***Т. І. НАРЭЙКА***

# ПРАБЛЕМЫ ГІСТАРЫЯГРАФІІ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЕЗУІТАЎ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

Гісторыя дзейнасці каталіцкага манаскага ордэна езуітаў на Беларусі ў канцы XVI—XVIII ст. даследавалася айчыннымі і замежнымі гісторыкамі. Аднак у Расійскай імперыі, а потым у савецкай краіне не надта шанавалі ўсе каталіцкія ордэны, але найболей даставалася езуітам. Класавая нялюбасць гісторыкаў, а разам з ёю варожасць праваслаўнай царквы стварылі ўяўленне пра езуітаў як пра цемрашалаў, людзей небяспечных ды кемлівых і наогул з усіх бакоў не нашых. Такі гістарычны падыход да дзейнасці езуітаў быў прадыктаваны тагачаснай ідэалогіяй. Існуе думка сярод гісторыкаў, што наступ езуітаў рэзка абвастрыў міжканфесіянальную сітуацыю на беларускіх землях, падзяліў грамадства на варожыя лагеры паводле веравызнання, унёс разлад і небяспеку. Шэраг прац, аўтары якіх прытрымліваюцца дадзенага погляду, ствараюць гістарыяграфію езуітаў. Да іх адносяцца: Л. Н. Велікові́ч, Я. Н. Мараш, Д. Е. Міхневіч, С. Ф. Цярохін і інш. Іх манаграфіі, насычаныя багатай фактурай, імкнуцца даказаць тэзіс, што касцёлы і кляштары ва ўсходняй частцы Беларусі мелі на мэце не толькі насаджэнне каталіцтва сярод беларускага насельніцтва, але і стварэнне плацдарма для пранікнення ў глыб Расіі [1]. Тым больш, што праявы культурна-асветніцкай дзейнасці езуітаў на беларускіх землях заставаліся па-за ўвагай даследчыкаў.

Але ў 90-я гг. XX ст. у перыядычным друку і на старонках гістарычных зборнікаў з'яўляюцца артыкулы «маладых» гісторыкаў, якія імкнуцца абвергнуць стары падыход да гісторыі ордэна, робячы націск на вывучэнне дабрачынных спраў і асветніцкай дзейнасці. Да маладых аўтараў-наватараў



адносяцца: У. Арлоў, А. Жлутка, Л. Карнілава, С. Марозава, С. Палуцкая, А. Самусік, Ю. Лаўрык і іншыя. У іх работах дамінуе тэзіс аб тым, што езуіты стварылі самую перадавую для свайго часу сістэму асветы.

Існуе шэраг аб'ёмных прац, якія непасрэдна прысвечаны гісторыі стварэння і развіцця ордэна езуітаў як у Заходняй Еўропе, так і на Беларусі. Гэта такія аўтары, як А. Андрэеў, Г. Бемер, Т. Блінова, Л. Велікові́ч, Т. Грызенгер, К. Дзмітрак, Б. Печнікаў, А. Тондзі, С. Цярохін.

Як ужо зазначалася, з паасобных артыкулаў можна даведацца аб часткова вывучанай гісторыкамі дзейнасці езуітаў на Беларусі ў канцы XVI—XVIII ст. Традыцыі місіянерскай дзейнасці манаскіх каталіцкіх ордэнаў на Беларусі грунтоўна выклала Л. Карнілава. Яна прыводзіць залежнасць пашырэння або змяншэння сеткі каталіцкіх манаскіх кляштараў ад падзей, што адбываліся ў палітычным і рэлігійным жыцці краіны, а таксама дае колькасныя статыстычныя дадзеныя заснавання кляштараў. Калі ў першай палове XVII ст. было заснавана 53 кляштары, у другой палове XVII ст. — 50, то ў першай палове XVIII ст. іх было заснавана 35 [2]. А. Тондзі гаворыць аб больш высокай у параўнанні з іншымі рэлігійнымі аб'яднаннямі культурнай і псіхалагічнай падрыхтоўцы езуітаў. Можа, таму поспехі езуітаў у немалай ступені тлумачацца простай, мэтазгоднай і эфектыўнай арганізацыяй самога закону [3].

Паколькі езуіты былі зброяй у руках папы рымскага для барацьбы з Рэфармацыяй, то гэты важны аспект у гісторыі нельга не закрануць у гістарыяграфічным даследаванні. На пачатку XVI ст. каталіцкая рэлігія ўваходзіць у паласу крызісу. Сутнасць яго зводзіцца да крытычных адносін шляхты да каталіцкага культу, арганізацыі касцёла і яго палітыкі. З. Зуева імкнецца вывесці прычыну ўзнікнення Рэфармацыі. Рэфармацыйны рух на Беларусі развіваўся ў агульнаеўрапейскай плыні антыкаталіцтва [4]. С. Ф. Цярохін вывучае агульную характарыстыку сітуацыі на Беларусі ў XVI ст., дае пералік пратэстанцкіх абшчын і прозвішчаў феадалаў-рэфарматараў. З яго даследавання відаць, якім чынам езуіты крок за крокам перамагаюць Рэфармацыю [5]. Тэму Рэфармацыі і ролю езуітаў у яе спадзе развівае Ю. Туронак. Ён тлумачыць наступствы рэфармацыйнага руху для «літоўскай» шляхты. Дае сваю ацэнку ў бок акаталічвання [6].

Характар умяшання езуітаў у справу уніі, прапаведніцкая місія ў гэтым накірунку апісваецца ў працах С. А. Цярохіна, З. І. Зуевай, Д. Е. Міхневіча, С. В. Марозавай, А. Мартаса, Г. Н. Шэйкіна і г. д. Міхневіч адзначае, што унія была паўмерай: раскол дазваляў натраўліваць уніятаў і праваслаўных адзін на аднаго [7]. Шэйкін падкрэслівае, што ва ўмовах Беларусі унія з'явілася спосабам акаталічвання і паланізацыі жыхароў.

Некаторыя даследчыкі разглядаюць адносіны паміж езуітамі і базыльянамі: Я. К. Анішчанка, Д. Е. Міхневіч, С. В. Марозава даюць ацэнку XVI ст. як часу сутыкнення і ўзаемадзеяння дзвюх цывілізацый і іх культур, ідэалогій і рэлігій. Адносіны паміж праваслаўнымі, уніятамі і католікамі, а таксама аб дыскрымінацыі праваслаўнага насельніцтва з боку ўлады тлумачаць дакументы, якія змешчаны ў хрэстаматыйных зборніках [8].

Гісторыю скасавання ордэна на той частцы, якая адышла да Расійскай імперыі, вывучалі Я. К. Анішчанка, М. Смяховіч, А. П. Сапуноў, У. А. Сосна і г. д. Я. К. Анішчанка апісвае ўмовы ўмяшання Расіі ў рэгуляванне пытанняў Беларусі [9]. М. Смяховіч тлумачыць палітыку Кацярыны ІІ у дачыненні да рэлігійнага пытання на Беларусі [10].

Таксама разглядаецца, і гэта асноўнае, уклад езуітаў у захаванне антычнай спадчыны на Беларусі, развіццё тэатральнага і музычнага мастацтваў. У гэтай сувязі неабходна згадаць вучоных, даследаванні якіх дапамаглі ўзнавіць культурна-гістарычныя тэндэнцыі таго часу. У першую чаргу гэта Тамара Барысаўна Блінова, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. Даследуе дзейнасць ордэна езуітаў на Беларусі [11]. Таксама А. Ф. Самусік, А. Жлутка, Ю. Лаўрык, Ул. Арлоў вывучаюць асобныя аспекты культурна-асветніцкай дзейнасці езуітаў. Вельмі падрабязнае апісанне структуры і арганізацыі езуіцкіх навучальных устаноў на Беларусі дае А. Жлутка, а таксама У. Арлоў. А. Самусік прыводзіць пазітыўныя і негатыўныя бакі ў асветніцкай дзейнасці езуітаў. Ён узгадвае пра гісторыю манаскіх навучальных устаноў на Беларусі ў XIX ст. Апісвае дзейнасць Адукацыйнай камісіі, арганізацыю Віленскай навучальнай акругі. Робіць выснову, што дзейнасць манаскіх школ была цесна звязана са знішчэннем апошніх рэштказ сярэднявечча. У сваіх работах ён паказвае цэласны навучальны працэс і робіць спробу абагульнення даследаванняў, якія існавалі раней, імкнецца да аб’ектыўнасці [12].

Многія аўтары лічаць, што асветніцкая дзейнасць езуітаў з’явілася галоўным фактарам поспеху той працы, якую здзяйснялі езуіты на Беларусі. Даследчыкі прыводзяць факты аб заснаванні навучальных устаноў. І калі А. Жлутка больш увагі надае заснаванню Віленскай акадэміі, то У. Арлоў вывучае гісторыю Полацкага калегіума. Звесткі аб іншых навучальных установах закону можна ўзяць у работах Т. Б. Бліновай, якая на дадзены час больш грунтоўна даследавала гісторыю дзейнасці ордэна. Вялікая ўвага надаецца моўнай праблеме. С. В. Цярохін сцвярджае, што езуіты прынеслі беларускай мове шмат паланізмаў і лацізмаў. Даследчыкі лічаць, што пашыранай думцы пра забарону ў езуіцкіх школах беларускай мовы пярэчаць факты. Мяркуючы па штогадовых справаздачах калегіумаў, выкладанне ў



малодшых класах ішло менавіта па-беларуску. Усе гэтыя аўтары прытрымліваюцца фактаў, якія змешчаны ў дакументах. У прыватнасці, Т. Блінова звярталася ў фонды Цэнтральнага дзяржаўнага архіва старажытных актаў у Маскве, архіваў Вільні, Гродна і інш. [13]

Польская гістарыяграфія багатая на вядомыя імёны даследчыкаў, якія займаліся праблематыкай каталіцкага касцёла на Беларусі і ў Літве ў канцы XVI—XVIII ст. У 1999 г. выдавецтва Гданьскага універсітэта друкуе манаграфію Казіміра Пухоўскага «Гістарычная навука ў езуіцкіх калегіях Рэчы Паспалітай 1563—1773». Аўтар працаваў з дакументамі вялікай колькасці бібліятэк і архіваў. Пухоўскі даводзіць да чытача, наколькі важнай была гісторыя як прадмет. Ён узгадвае пра каталогі, дзе былі пералічаны імёны прафесараў, назвы іх прац. Езуіцкія асабовыя каталогі змешчаны ў бібліятэках і архівах Польшчы [14].

У 1950 г. у Лодзі была надрукавана работа Лукаша Курдыбаха «Гуманізм і езуіты». Даследчык вывучае гісторыю асветы і выхавання ў парафіяльных школах. Аўтар параўноўвае розныя тыпы школ, непрыязна ставіцца да манапалістычнай ролі касцёла ў адукацыі [15].

Адзін са знакамітых польскіх даследчыкаў Януш Тазбір прысвяціў свае работы праблемам Контррэфармацыі ў Рэчы Паспалітай. У 1978 г. у Варшаве выдадзена яго манаграфія «Петр Скарга». У гэтай кнізе ёсць біяграфічныя звесткі езуіта Скаргі, адлюстравана яго рэлігійная дзейнасць.

Польскі даследчык Р. Дароўскі на аснове пісьмовых нататак, пакінутых прафесарамі філасофіі, вывучае стан навучання ў езуіцкіх навучальных установах Польшчы і Літвы [16].

На жаль, пакуль гісторыя культурна-асветніцкай справы езуітаў на беларускіх землях з’яўляецца адной з так званых белых плямаў у мінулым нашай краіны. Гэта адбылося з-за таго, што дадзеная праблема не стала аб’ектам асобнага навуковага даследавання ў беларускай гістарыяграфіі, а ў агульных працах па гісторыі духоўнай культуры Беларусі езуіцкі перыяд развіцця беларускай адукацыі доўгі час разглядаўся аднабакова і тэндэнцыйна.

На сёння неабходна правесці ўсебаковае даследаванне гісторыі культурна-асветніцкай дзейнасці каталіцкага ордэна езуітаў на Беларусі і ў Літве ў канцы XVI—XVIII ст. Па-першае, патрабуецца выявіць характар культурнай і асветніцкай дзейнасці езуітаў, сутнасць і ролю плённай працы на ніве культуры і

асветы; па-другое, узнавіць гістарычныя прадпасылкі ўзнікнення ордэна езуітаў; па-трэцяе, прааналізаваць мэты і задачы, якія ставілі перад сабой члены ордэна, і раскрыць асноўныя рухальныя сілы працэсу ды-



намічнага развіцця культурна-асветніцкай дзейнасці езуітаў на Беларусі і ў Літве ў канцы XVI—XVIII ст.

---

[1] *Мараш Я. Н.* Ватикан и католическая церковь в Белоруссии. Мн., 1971.

[2] *Карнілава Л. А.* Каталіцкія і манаскія ордэны на беларускіх землях ВКЛ у XIV—XVIII стст. // Матэрыялы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі, 1997 г. Гродна, 1998.

[3] *Тонди А.* Иезуиты. М., 1955.

[4] *Зуева З. І.* Беларусь у складзе Рэчы Паспалітай. Культура Беларусі (1569—1795) // Гісторыя і культура Беларусі: Метад. дапам. Мн., 1994.

[5] *Цярохін С. Ф.* Многія прыйдуць пад імем маім. Мн., 1995.

[6] *Туронак Ю.* Фармаванне сеткі рыма-каталіцкіх парафіяў у Беларусі (1387—1781) // Беларускі гістарычны агляд. Мн., 1995. Т. 2. Сш. 2.

[7] *Міхневич Д. Е.* Очерки из истории католической реакции. М., 1955.

[8] Хрестоматия по истории Белоруссии / Под ред. А. П. Игнатенко. Мн., 1977.

[9] *Анішчанка Я. К.* Міжканфесійныя канфлікты ў Беларусі напярэдадні першага падзелу Рэчы Паспалітай // Весці АН Беларусі. Мн., 1995. № 3.

[10] *Смяховіч М.* Узаемаадносіны самадзяржаўя з каталіцкай царквой на Беларусі (1772—1867) // БГЧ. 1995. № 1.

[11] *Блинова Т. Б.* Иезуиты в Белоруссии. Мн., 1990.

[12] *Самусік А.* Дзейнасць манаскіх ордэнаў у галіне асветы на Беларусі ў XIX ст. // Гісторыя: праблемы выкладання. 1998. № 1.

[13] *Блинова Т. Б.* Указ. соч.

[14] *Puchowski K.* Edukacja Historyczna w jezuickich kolegiach Rzeczypospolitej 1565—1773. Gdańsk, 1999. S. 24.

[15] *Kurdybacha L.* Humanizm i jezuici. Łódź, 1950. S. 34.

[16] *Darowski R.* Filozofia w szkolach jezuickich w Polsce w XVI w. Kraków, 1994.